***В. С. Сідаровіч,*** *аспірант*
*кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАЗІЦЫЯ Я. І. ЛЮБАНСКАГА – ДЭПУТАТА ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ І СКЛІКАННЯ

Сур'ёзныя праблемы, якія існавалі ў расійскім грамадстве ў канцы XIX – пачатку XX ст. і выкліканая імі рэвалюцыя 1905–1907 гг. прывялі да глыбокіх змен у сацыяльна-палітычным жыцці Расійскай імперыі. Разумеючы пагрозу, якая навісла над дзяржавай, Мікалай ІІ падпісаў шэраг дакументаў, якія садзейнічалі стабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі на абшарах краіны на бліжэйшыя 12 год. 6 жніўня 1905 г. былі выдадзены адны з самых важных дакументаў гэтага перыяду: «Манифест об учреждении Государственной Думы» і «Высочайше утвержденное Положение о выборах в Государственную Думу» (далей – «Положение»). Яны абвяшчалі стварэнне першага расійскага парламента і зацвярджалі правілы правядзення галасавання для выбараў дэпутатаў Думы, прызначаных на люты-сакавік 1906 г.

Галоўнай асаблівасцю выбараў 1906 г. была іх шматступеньчатасць. У землеўласніцкай курыі[1], да якой належыў Я. Любанскі – прадстаўнік мінскіх землеўласнікаў, гласны гарадской Думы, актыўны грамадскі дзеяч і таленавіты прадпрымальнік, уласнік маёнтка Лошыца, выбарчая кампанія праходзіла па наступным сцэнарыі: асобы, чыя маёмасць адпавядала патрабаванням (ва ўласнасці ад 100 да 650 дзесяцін зямлі і нерухомая маёмасць коштам не менш за 15 тысяч рублёў), абіралі на павятовым ці гарадскім[2] з'ездзе дэлегатаў на губернскі сход, якія атрымалі статус выбаршчыкаў і пасля абіралі дэпутатаў Думы.

[1] Курыя – група выбаршчыкаў, створаная на падставе сацыяльнай прыналежнасці і маёмаснага цэнзу. Падчас выбараў у І Дзяржаўную Думу існавала 4 курыі: землеўласніцкая, гарадская, сялянская і рабочая.

[2] У адпаведнасці з «Положением» асобныя гарадскія выбары адбываліся толькі ў буйных гарадах. У Паўночна-Заходнім краі гэта права атрымала Вільня. Астатнія гарады абіралі дэлегатаў на губернскія сходы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з дадаткам да артыкула 4 «Положения» Мінскай губерні прызначылі 135 выбаршчыкаў: 74 ад з’езда землеўласнікаў (54,8 % ад агульнай колькасці), 20 ад гарадскога з’езда і 41 ад з’езда ўпаўнаважаных. На тэрыторыі Мінскай губерні асноўная барацьба падчас выбараў вялася паміж прадстаўнікамі манархічнага кірунку з «Саюза рускага народа» і «Паўночна-Заходняга рускага веча», акцябрыстаў з «Саюза 17 кастрычніка» і «Прагрэсіўнай партыі», а таксама прадстаўнікамі Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (кадэтамі). 4, 5 і 6 красавіка 1906 г. у губерні адбыліся з’езд упаўнаважаных, павятовыя і 9 гарадскіх з’ездаў, на якіх было абрана адпаведна 41, 72, 18 выбаршчыкаў [7, с. 47].

Першы этап выбарчай кампаніі ў беларускіх губернях паказаў, што сур'ёзны ўплыў на працэс аказвае нацыянальны прынцып. З мэтай захавання пазіцый «літвінаў па паходжанні, палякаў па нацыянальнасці» актыўную дзейнасць пачаў рух краёўцаў, якія дабіваліся адміністрацыйна-тэрытарыяльнай аўтаноміі для зямель былога ВКЛ, мясцовага кіравання азначанымі землямі і стварэння краёвага парламента ў Вільні. Маючы адзіныя мэты, але розныя шляхі дасягнення, члены руху падзяліліся на два лагеры – кансерватыўны і дэмакратычны. У лік першых уваходзілі буйныя землеўласнікі Раман Скірмунт, Эдвард Вайніловіч і інш. Дэмакратычную плынь партыі ўтваралі прадстаўнікі інтэлігенцыі: Міхал Ромер, Людвік Абрамовіч і інш. Я. Любанскі спрабаваў заняць максімальна нейтральную пазіцыю, і па сваіх поглядах набліжаўся да дэмакратычнай плыні [8, с. 121].

Асабліва жорсткай была барацьба ў час трэцяга этапу выбараў – у Мінскім губернскім выбарчым сходзе. Падчас галасавання выбаршчыкі размежаваліся на тры групы: памешчыкі-каталікі (≈ 60 галасоў), праваслаўныя сяляне (≈ 50 чалавек) і яўрэі з гарадоў (≈ 20 чалавек). Часовая кааліцыя памешчыкаў і гараджан (≈ 80 галасоў) прывяла да таго, што землеўласнікі змаглі правесці ў парламент 7 прадстаўнікоў: акрамя Я. Любанскага імі сталі А. Лядніцкі, П. Масоніус, В. Янчэўскі, Г. Друцкі-Любецкі, Р. Скірмунт, Я. Вішнеўскі (абіраліся ад кадэтаў). Усяго ж ад Мінскай губерні ў Дзяржаўную Думу I склікання было абрана 9 дэпутатаў. Акрамя вышэйназваных, абавязковае месца ад сялян заняў С. Гатоўчыц, а ад гарадскіх выбаршчыкаў – прысяжны паверараны С. Разенбаум [1 с. 169–177].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адкрыццё Думы, у якую было абрана 448 дэпутатаў, адбылося 27 красавіка 1906 г. у Таўрыйскім палацы. Па звестках М. А. Барадзіна – гісторыка і дэпутата – падчас першых пасяджэнняў кадэты займалі 153 месцы (34,1 %) [2, с. 37]. З цягам часу дэпутаты пачалі фарміраваць групоўкі па тэрытарыяльна-рэлігійнай прымеце. Так, 4 мая 1906 г. з дэпутатаў-католікаў было ўтворана «Тэрытарыяльнае кола» («Группа западных окраин», «Koło Krajowe Litwy i Rusi»), у яго склад увайшлі некаторыя прадстаўнікі партыі кадэтаў, у тым ліку і Я. Любанскі.

Актыўная праца пачалася толькі пасля афіцыйнага зацвярджання вынікаў выбараў на сёмым пасяджэнні 12 мая 1906 г., аб чым у стэнаграфічнай справаздачы маюцца адпаведныя звесткі [3, с. 288]. Першыя тыдні працы Думы адзначыліся распрацоўкай асноўных дакументаў, якія рэгулявалі працу парламента, і фарміраваннем парламенцкіх камісій.

З вялікай цяжкасцю адбываўся працэс па стварэнні бюджэтнай камісіі – адной з шасці пастаянных у Думе. Дзясятае пасяджэнне (16 мая 1906 г.) было амаль цалкам прысвечана распрацоўцы дакументаў камісіі, і толькі пад вечар дэпутаты займелі магчымасць прыступіць да абрання яе членаў. Я. Любанскі, пра поспехі ў фінансава-эканамічнай дзейнасці якога ў Мінскай губерні добра ведалі амаль усе дэпутаты, змог набраць 234 галасы і паспяхова абраўся ў бюджэтную камісію [4, с. 1440].

Асноўным напрамкам дзейнасці бюджэтнай камісіі стаў кантроль за выкарыстаннем грашовых сродкаў, аналіз артыкулаў і параграфаў дзяржаўнага бюджэту [Там жа]. Трэба сказаць, што праца працякала вельмі марудна, і за ўвесь час дзейнасці камісія змагла вынесці на абмеркаванне Думы толькі некалькі прапаноў, якія датычыліся асігнавання грашовых сродкаў на дапамогу пацярпелым ад неўраджаю. Адна з гэтых прапаноў была прынята 23 чэрвеня 1906 г. у якасці закона «Аб асігнаванні 15 мільёнаў рублёў на харчовую дапамогу галадаючаму насельніцтву» – аднаго з двух, прынятых І Думай [6, с. 177]. Удзел Яўстаха Любанскага ў распрацоўцы закона не асвячаецца ў крыніцах па дзейнасці парламента, але, хутчэй за ўсё, яго добрыя веды ў эканамічнай сферы знайшлі прымяненне ў гэтым працэсе і аказалі пэўны ўплыў на фарміраванне выніковага тэкста закона.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пытаннем, патрабуючым далейшага даследавання, безумоўна, з'яўляецца зусім невысокая, асабліва ў параўнанні з іншымі дэпутатамі ад Мінскай губерні, актыўнасць Я. Любанскага і ў іншых кірунках дзейнасці Дзяржаўнай Думы. Як сведчыць асабісты алфавітны паказальнік дэпутатаў, Любанскі за 40 пасяджэнняў парламента падпісаў толькі 10 запытаў, якія, аднак, яскрава адлюстроўваюць дэмакратычныя погляды ўласніка Лошыцы [5, с. 79].

Так, на пасяджэннях парламента ў маі 1906 г. па прапанове групы дэпутатаў, сярод якіх быў і Я. І. Любанскі, разглядаліся запыты аб незаконным утрыманні ў турмах Мінска і Варшавы палітычных вязняў, высылцы з Роўна людзей без прад'яўлення абвінавачвання ў неабходны па законе тэрмін (запыты № 23, 40, 41, 7), а таксама аб смяротным пакаранні рабочых з Рыгі за ўдзел у забойстве паліцэйскіх (запыт № 13б). На чэрвеньскіх пасяджэннях разглядаліся пытанні аб смяротным пакаранні непаўналетняга селяніна Папая і мешчаніна Вальчэўскага з Варшавы (запыты № 213, № 296), незаконным утрыманні ў турмах Мінска і Варшавы і высылцы вязняў без прад'яўлення абвінавачвання (запыты № 239, № 314), нанясенні фізічных траўм члену Дзяржаўнай Думы Здзельнікаву (запыт № 258). Запыты ішлі ў агульным рэчышчы платформы фракцыі кадэтаў, але паказвалі і занепакоенасць дэпутатаў ад іншых аб'яднанняў часам значным перабольшанне паўнамоцтваў мясцовых прадстаўніцтваў МУС.

У агульным, Дзяржаўная Дума I склікання аказала сур'ёзны ўплыў на грамадска-палітычнае развіццё рэгіёнаў Расійскай імперыі. Прадстаўнікі губерняў, дзякуючы Думе, звярнулі ўвагу на асноўныя праблемы сваіх выбарчых акруг і паказалі небяспеку ад праблем, якія назапасіліся ў краіне. Нягледзячы на тое, што па шэрагу прычын I Дума праіснавала ўсяго 72 дні, дзейнасць яе дэпутатаў, у тым ліку Яўстаха Любанскага, стала індыкатарам зацікаўленасці грамадства ў мадэрнізацыі сацыяльна-палітычнага жыцця краіны, што вызначыла асноўныя кірункі працы II, III і IVскладу парламента.

---

1. *Боиович, М. М.* Члены Государственной думы (портреты и биографии). Первый созыв 1906–1911 г. (Сессия продолжалась с 27 апр. по 9 июля 1906 г.) / сост. М. М. Боиович. – М. : т-во И. Д. Сытина, 1906. – 508 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Бородин, Н. А.* Государственная Дума в цифрах / Н. А. Бородин. – СПб. : типография т-ва Общественная Польза, 1906. – 72 с.
3. Государственная Дума. Стенографические отчеты. 1906 г. Том I. – СПб. : Государственная типография, 1906. – 866 с.
4. Государственная Дума. Стенографические отчеты. 1906 г. Том II. – СПб. : Государственная типография, 1906. – 2013 с.
5. Государственная Дума. Указатель к стенографическим отчетам. 1906 г. Сессия первая. Заседания 1–38 (27 апреля – 4 июля 1906 г.). – СПб. : Государственная типография, 1906. – 316 с.
6. *Езерский, Н. Ф.* Государственная Дума первого созыва / Н. Ф. Езерский. – Пенза : Типолитография Е. М. Грушецкой, 1907. – 201 с.
7. *Забаўскі, М. М.* Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.) : манаграфія / М. М. Забаўскі. – Мінск : БДПУ, 2008. – 267 с.
8. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 г. / пад. рэд. С. Куль-Сяльвестравай. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 322 с.

***И. А. Смирнова,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*профессор кафедры искусства эстрады*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*

# ДЖАЗМЕН ИЗ ГУЛАГА: КИНЕМАТОГРАФИЧЕСКИЙ ПОРТРЕТ Э. РОЗНЕРА




Современные условия, в которых развивается белорусская художественная культура, дают возможность переосмыслить и оценить достижения ее советского прошлого. К ним относится и творчество выдающегося джазового музыканта Эдди Рознера, внесшего значительный вклад в историю развития белорусского джаза.

В истории мирового музыкального искусства Э. Рознер (Адольф Эдуард Рознер) известен как артист многогранного дарования. Он был композитором, дирижером, шоуменом, аранжировщиком, режиссером и выдающимся виртуозом – ис-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ